# Экалогія
# Трыццаць метраў – не трыццаць кіламетраў

За летні перыяд бягучага года за парушэнне рэжыму ўтрымання водаахоўных зон і прыбярэжных палос раённай інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 15 чалавек.

Многія жыхары і госці рэгіёна ля вадаёмаў забываюць пра элементарныя правілы і патрабаванні, якія трэба выконваць, знаходзячыся на водаахоўнай тэрыторыі.

Па словах Марыны Наваковіч, начальніка райінспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, галоўная прычына спрэчак прадстаўнікоў прыродаахоўных органаў з аўтааматарамі, - адлегласць ад прыпаркаванай машыны да зрэзу вады. Некаторыя нават не ведаюць, якой яна павінна быць – 10 альбо 30 метраў.

- Ёсць людзі, якія пад'язджаюць да азёр па землях сельскагаспадарчага прызначэння, - расказвае Марына Леанідаўна, – псуюць збожжавыя культуры. Не спыняюць іх і кусты ўздоўж берагавой лініі. Яны высякаюць расліннасць, каб расчысціць праезд да вады.

У сувязі са шматлікімі фактамі парушэнняў правілаў стаянкі ў межах водных аб'ектаў, начальнік райінспекцыі ў чарговы раз нагадвае нагадвае, што згодна з артыкулам 77 Воднага кодэкса Рэспублікі Беларусь у межах водаахоўных зон і прыбярэжных палос водных абъектаў забаронена стаянка механічных сродкаў, за выключэннем спецыяльна адведзеных ва ўстаноўленым парадку месцаў. Транспарт павінен знаходзіцца не бліжэй чым за 30 метраў ад берагавой лініі. За невыкананне закона прадугледжаны штраф у памеры да 10 базавых велічынь.



Трыццаць метраў - не трыццаць кіламетраў. Не проста так закон забараняе блізкую да вады стаянку, а таксама і мыццё машын. Водаахоўная зона прызначана для прадухілення забруджвання, засмечвання і спусташэння водных аб'ектаў, а таксама захавання асяроддзя пражывання жывёльнага і расліннага свету на тэрыторыях, якія прылягаюць да іх.

*Ала ЯКАЎЛЕВА (газета «Голас Сенненцыны»)*